4. Конг К. Наука и ученые во время культурной революции в Китае: 1966–1976 // Науковедение. 2000, № 4.

5. Легенда горы Тяньюньшан. [Кинофильм] / реж. Се Цзинь ; оператор Сюй Ци ; сценарий Лу Яньчжоу. КНР, 1980. 126 мин.

6. Любовь под ветвями боярышника. [Кинофильм] / реж. Чжан Имоу ; оператор Чжао Сяодин ; сценарий Инь Личуань, Гу Сяобай, А Мэй. КНР, 2010. 114 мин.

7. Медведев Р. А. Подъем Китая. М. : Астрель, 2012.

8. Платформа. [Кинофильм] / реж. Цзя Чжанкэ ; оператор Ю Ликвай ; сценарий Цзя Чжанкэ. – КНР, Франция, Япония, 2000. 154 мин.

9. Поселок Фужун. [Кинофильм] / реж. Се Цзинь ; оператор Лу Цзюньфу ; сценарий А Чэн, Се Цзинь. КНР, 1986. 164 мин.

10. Синий воздушный змей. [Кинофильм] / реж. Тянь Чжуанчжуан ; оператор Хоу Юн ; сценарий Мао Сяо. КНР, 1993. 140 мин.

11. Сосланная. [Кинофильм] / реж. Джоан Чэнь ; оператор Люй Юэ ; сценарий Янь Гэлин, Джоан Чэнь. КНР, 1998. 99 мин.

12. Табунщик. [Кинофильм] / реж. Се Цзинь ; оператор Чжу Юндэ, Чжан Юнчжэн ; сценарий Ли Чжунь. КНР, 1982. 106 мин.

13. Утраченная юность. [Кинофильм] / реж. Чжан Нуаньсинь ; оператор Му Дэюань, Дэн Вэй ; сценарий Чжан Нуаньсинь, Чжан Маньлин. КНР, 1985. 92 мин.

# ТВОРЧАСЦЬ ЦЗЭН ФАНЬЧЖЫ Ў РАКУРСЕ СУЧАСНЫХ ПРАЯЎ ЭКСПРЭСІЯНІЗМУ

**М. Л. Карпянкова**

*Мінскі абласны цэнтр народнай творчасці,*
*Гікала, 4, 220005, г. Мінск, Беларусь, m.l.karpenkova@gmail.com*

Артыкул прысвечаны аналізу творчасці Цзэн Фаньчжы — сучаснага кітайскага мастака ў творчасці якога вылучаюцца рысы экспрэсіянізму. Карціны Цзэн Фаньчжы разглядаюцца комплексна, у кантэксце з агульнымі тэндэнцыямі ў кітайскім сучасным мастацтве. Аўтар апісвае канцэпцыі і кантэнт ключавых выстаў мастака. Упершыню праведзена тыпалагізацыя творчасці Цзэн Фаньчжы і вылучаны тры асноўныя групы твораў, якія датычацца: тэмы чалавека; абстрактнага краявіду, рэмінісцэнцый сусветнай мастацкай спадчыны.

***Ключевые слова:*** экспрессионизм; Цзэн Фаньчжи; Китай; живопись; выставка; современное искусство; реминисценция.

# THE WORK OF ZENG FANZHI FROM THE PERSPECTIVE OF MODERN MANIFESTATIONS OF EXPRESSIONISM

**M. L. Karpiankova**

*Minsk Regional Center of Folk Art,*
*Gikala, 4, 220005, Minsk, Belarus, m.l.karpenkova@gmail.com*

The article is devoted to the analysis of the work of Zeng Fanzhi, a contemporary Chinese artist. There are features of expressionism in his work. Paintings by Zeng Fanzhi are considered comprehensively, in context with general trends in Chinese contemporary art. The author describes the concepts and content of the artist's main exhibitions. For the first time, the typology of Zeng Fanzhi's work was carried out and three main groups of works were identified: the theme of man; abstract landscape, reminiscences of the world artistic heritage.

***Keywords:*** expressionism; Zeng Fanzhi; China; painting; exhibition; contemporary art; reminiscence.

Змены ў кітайскім грамадстве, якія адбываюцца з 1978 г. пасля распачатай «палітыцы рэформ і адкрытасці» прыводзяць да засваення і пераасэнсавання кітайскімі мастакамі многіх напрамкаў мадэрнізму, у тым ліку вялікай папулярнасцю карыстаецца экспрэсіянізм. У канцы XX–пачатку XXI ст. з'явіўся цэлы шэраг мастакоў, якія ў сваёй творчасці дэманструюць з аднаго боку глыбока індывідуальную, а з другога – вельмі нацыянальную версію «новага» экспрэсіянізму. У пачатку XXI ст. для кітайскіх мастакоў галоўным аб'ектам для разваг і адлюстравання становіцца чалавек. Многія творцы звяртаюцца да жанру партрэт, некаторыя ствараюць збіральныя вобразы чалавека, іншыя будуюць гісторыі з некалькімі персанажамі. Шэраг мастакоў канцэнтруюцца на распрацоўцы каларыстычнай экспрэсіяністычнай спецыфіцы, вельмі часта імі абірацца палымяны чырвоны колер. Гэтае адценне становіцца своеасаблівым канцэнтратам эмоцый у творах Хан Ву Шэна, Ван Ігуана, Чжан Сяогана. Многія мастакі галоўную ўвагу надаюць выяўленню эмацыянальнага напружання праз выраз твару і жэсты персанажаў, напрыклад як Лю Сяодун, Юэ Міньцзюэнь.

Сёння, мастак Цзэн Фаньчжы (曾梵志), які ўжо мае сусветную вядомасць звяртаецца да надзвычай шырокага спектру выразных і выяўленчых мастацкіх сродкаў экспрэсіянізму. Мастак належыць да пакалення, якое жыве ў пераломную эпоху для Кітая. Цзэн Фаньчжы нарадзіўся ў 1964 г. у г.Ухане. У 1980-е гг. адбываецца мастацкае абуджэнне ў краіне, але Цзэн Фаньчжы ў гэты перыяд яшчэ быў занадта малады. Яго сталасць прыпала на кітайскую культурную рэвалюцыю, а

мастацкую адукацыю ён атрымаў у Хубэйскай акадэміі мастацтва, у якую паступіў з другога разу, змусіўшы чакаць новага набору чатыры гады. На арт-сцэне Цзэн Фаньчжы з’явіўся ў 1990-х гг. і адразу праявіў сабе як яскравы індывідуал і творца, што дынамічна развіваецца. Першую вядомасць яму прынесла серыя «Mask Series», 1996. Яна ж прынесла аўтару і неверагодны фінансавы поспех, калі адна з прац («Mask Series №6») серыі была прададзена на аўкцыёне Christie’s у Ган-Конгу за 9,7 млн долараў. Такім чынам у 2008 г. Цзэн Фаньчжы становіцца самым дарагім сучасным азіяцкім мастаком [1]. На палотнах серыі адлюстраваны групы людзей, якія быццам бы пазіруюць перад фатографам, яны рознага ўзросту і прафесійнай прыналежнасці. Іх аб'ядноўваюць маскі, якія закрываюць твары. Мастак ужывае тонкі псіхалагічны прыём: маскі вельмі складана адрозніць ад сапраўднага твару (глядач ідэнтыфікуе іх па больш светламу колеру і ледзь заўважным абрысам краёў і тонкім завязкам). Мы бачым маскі з самымі рознымі эмацыянальнымі выразамі ад усмешкі да плачу. Персанажы паказаны дастаткова стылізавана, прысутнічае агульная дэфармацыя прапорцый, павялічаны галовы і кісці рук. Мастак абірае насычаныя, нават «едкія» фарбы, умоўны каларыт. Вельмі часта ўжываецца насычана-жоўты фон і наўмысна больш чырвоны за натуральны колер для перадачы скуры (галава, рукі). Відавочна, што мастак праз вобраз маскі, якая выглядае быццам бы сапраўдны выраз твару чалавека, разважае пра шчырасць і ролевыя гульні ў сучасным грамадстве. Серыя была ўспрынята як вельмі актуальная не толькі кітайскімі, але і заходнімі гледачамі.

Перадумовай да стварэння гэтай серыі стаў яго «Бальнічны трыпціх», 1991 г., які быў напісаны ў якасці дыпломнага праекта. Гісторыя стварэння гэтага трыпціха пераклікаецца з гісторыяй стварэння знакамітага «Крыка» Эдварда Мунка. Кітайскі мастак жыў каля шпіталю, акрамя таго, вельмі часта хадзіў у яго карпусы каб мець магчымасць прыняць душ (памыцца), таму часта бачыў хворых і персанал бальніцы. Нарвежскі мастак таксама задумваў сваю культавую працу, які рэфлексію на ўбачаных і пачутых душэўна хворых у бальніцы побач з якой ён часта праходзіў. Персанажы трыпціху Цзэн Фаньчжы ўжо маюць характэрную для стылістыцы яго ранняй творчасці дэфармацыю цел, яны застылі, таксама як перад фотакамерай. Палотны перадаюць агульную атмасферу пакут эмацыянальных і фізічных. Трыпціх з'яўляецца прыкладам карэляцыйнага мастацкага падыходу да жывапісу і псіхалогіі.

У асноўным Цзэн Фаньчжы цікавіцца побытавым жыццём суайчыннікаў, іх штодзённымі думкамі і эмоцыямі. З 1993 г. мастак працуе ў Пекіне, яго працы выстаўляюцца ў розных галерэях свету, ладзяцца і персанальныя выставы.

Аднак, вельмі важнай рэтраспектыўнай і першай персанальнай выставай у Пекіне стаў праект 2016 г. «Zeng Fanzhi : Parcours» у The Ullens Center for Contemporary Art (UCCA). Выстава аб'яднала каля 60 работ за 30 год творчага жыцця мастака. Вельмі канцэптуальным з'яўлялася экспазіцыйнае вырашэнне архітэктуры выставы (Philip Tinari, Guo Xi). У якасці «фундамента» вырашаны сцены па перыметры, якія былі афарбаваны ў цёмна-шэры колер і на якіх размяшчаліся найбольш раннія працы. Цэнтр залы займалі 6-ць белых сценак, якія былі пастаўлены па дыяганалям і мелі адтуліны-вокны, у якіх выбудоўваліся пэўныя сэнсавыя калідоры з тэматычна абгрунтаванымі ланцужкамі карцін. Выстава прадэманстравала ўсе грані творчага дыяпазону кітайскага мастака, яго вельмі асабістую візуальную мову, яго імкненне працаваць цыкламі і не баяцца змяняць стылістыку і сюжэты карцін. Пераклад назвы выставы трактуецца як «творчая вандроўка мастака, маршрут», што вельмі сімвалічна і дакладна характарызуе экспазіцыю.

У творчасці мастака можна вылучыць тры вялікія блокі.

1) Цзэн Фаньчжы перш за ўсё прываблівае тэма чалавека і яго ўзаемаадносіны з соцыумам. Гэта і збіральныя партрэты, і фігуры, дзе праз жэсты і дэфармацыю цела выражаецца эмацыянальны стан творцы. У рэчышчы гэтых работ можна прааналізаваць аўтапартрэт мастака 2009 г. Цзэн Фаньчжы паказвае сабе ў дастаткова спакойнай позе, ён сядзіць на зэдліку з доўгім муштуком у руцэ, вакол віецца плаўны струменьчык дыму. Напружанне эмоцый перадаецца праз элементы, якія кантрастуюць з спакойным тварам: чырвонае адзенне, чорныя сілуэты краявіду на фоне, нервовая фактура.

2) Рэмінісцэнцыі на сусветную мастацкую спадчыну ад элiністычных скульптур да твораў Люсьена Фрэйда. У якасці протамадэляў Цзэн Фаньчжы абірае: Дзюрэра, Леанарда да Вінчы, Ван Гога, Фрэнсіса Бэкана і інш. Свае «водгукі» на мастацкую спадчыну кітайскі жывапісец стварае ў рознай стылістыцы, аналізуючы, якія ідэі і прыёмы яму блізкія, а што адрознівае яго ад творцаў, што жылі раней за яго. У гэтым рэчышчы праграмнай з'яўляецца выстава 2016 г. «Цзэн Фаньчжи / Ван Гог», якая дэманстравалася ў Амстэрдаме [2]. Экспазіцыя спалучала карціны вядомага галандца і сучаснага кітайскага мастака. Цзэн Фаньчжы выкарыстоўвае аўтарскі жывапісны прыём — нанясенне экспрэсіўных рознаскіраваных доўгіх мазкоў-ліній па пастознай паверхні фарбы. Такім чынам пазнавальныя выявы з сусветна вядомых карцін пакрываюцца клубком графічных «экспрэсій» мастака-інтэрпрэтатара.

Другі прыклад удалага дыялогу са спадчынай (а менавіта з Леанарда да Вінчы) – гэта карціна «Тайная вячэра», 2001 г. Хрыстос і

яго вучні паказаны ў выглядзе піянераў з чырвонымі гальштукамі і маскамі на тварах. Толькі Іуда вылучаны жоўтым класічным заходнім гальштукам. Мастацкія крытыкі лічаць, што гэты персанаж сімвалізуе пераход Кітая да капіталізму. На пакрытым белым абрусам стале вылучаюцца крывава-чырвоныя кавалкі кавуноў. Квадратныя праёмы за спінамі апосталаў кітайскі мастак трансфармаваў у каліграфічныя світкі з лозунгамі. Стылістычна карціна напісана наўмысна спрошчана, выявы людзей маюць характэрныя павялічаныя галовы і кісці рук. Каларыстычная драматургія развіваецца за конт кантрасту чырвонага і белага колераў. Гэты твор у 2013 г. быў прададзены за 23, 3 млн. долараў, такім чынам мастак ізноў пацвердзіў статус самага дарагога азіяцкага сучаснага жывапісца.

3) «Абстрактныя краявіды» – выцягнутыя па гарызанталі шматметровыя фарматы, якія ўсмоктваюць гледача ў сваю прастору. Палотны маюць вібруючую паверхню, насычаную складанымі фактурамі (зёлкі, галінкі) і з настойлівай увагай да колеру, які перадаваў эфект палымнеючай травы. Кожны з краявідаў выбудоўваецца за конт дамінавання пэўнага колеру. Цікава, што краявід «Сіні», быў напісаны адценнямі фарбы, якія былі «пераняты» з колераў прыроды 10 рэгіёнаў Кітая.

Відавочна, што галоўны складнік творчасці Цзэн Фаньчжы – гэта ўменне трансфармаваць свае эмоцыі ў «блізкія» грамадству мастацкія вобразы. Жывапісец схільны да эксперыментаў, неаднаразова змяняе стылістыку і сюжэты сваіх работ. У працах Цзэн Фаньчжы прысутнічае скажэнне і дэфармацыя прапорцый цел персанажаў, спрошчаны характар малюнка, кантрасты тону і яркія колеры, атмасфера песімізму, эмацыянальная напружанасць і глыбіня вобразаў, а галоўнае непасрэдная сувязь з эмацыянальным інтэлектам мастака. Таму мы маем усе падставы каб ахарактарызаваць яго работы як праяву сучаснай версіі экспрэсіянізму.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ

1. Frances A. These 5 Paintings Show How Zeng Fanzhi Changed Contemporary Chinese Art // artsy.net. URL: https://www.artsy.net/article/artsy-editorial-these-5-paintings-show-how-zeng-fanzhi-changed-contemporary-chinese-art. (дата доступа: 11.04.2022).

2. Маслов, В. Полотна Ван Гога, переосмысленные китайцем Цзэнем Фаньчжи, выставлены в Амстердаме // Артхив. URL: https://arthive.com/ru/news/2949~Polotna_Van_Goga_pereosmyslennye_kitajtsem_Tszenem_Fan%27chzhi_vystavleny_v_Amsterdame (дата доступа: 11.04.2022).